# ЧАРОЎНЫЯ КАЗКІ НА НОЧ



УДК821.131.1-93-343.4 + 821.133.1-93-343.4
ББК83.84(4Ита)-445 + 83.84(4Фра)-445
Ч-21

*Серыя «Любімыя казкі» заснавана ў 2019 годзе*

*У перакладзе А. Емяльянава-Шыловіча, К. П. Масэ*

*Пераклад ажыццёўлены па выданні:*
*«Волшебные сказкі на ночь», Минск, Харвест, 2019 г.*

**Ч-21** **Чароўныя казкі на ноч** / перакл. з руск. мовы А. Емяльянаў-Шыловіч, К. П. Масэ. — Мінск : Харвест, 2019. — 32 с. : іл. — (Любімыя казкі).

ISBN 978-985-18-4719-4.

Чароўныя і мудрыя казкі, якія захаваліся ў памяці розных народаў свету, а таксама казкі вялікіх казачнікаў, раскажуць вашаму дзіцяці аб незвычайных прыгодах казачных герояў – нечаканых, дзіўных, смешных, добрых і павучальных!

У кнігу ўвайшлі казкі: «Пастушок – малы расток» (італьянская народная казка ў перакладзе К. П. Масэ), «Смешныя жаданні» (па матывах казкі Шарля Перо ў перакладзе А. Емяльянава-Шыловіча).

**УДК821.131.1-93-343.4 + 821.133.1-93-343.4**
**ББК83.84(4Ита)-445 + 83.84(4Фра)-445**

**ISBN 978-985-18-4719-4**

© Укладанне. Афармленне. Пераклад.
ТАА «Харвест», 2019.

(Італьянская народная казка)

# ПАСТУШОК – МАЛЫ РАСТОК



Жыў на свеце пастушок. Быў ён вельмі маленькага росту. Мабыць, таму і характар у яго быў нязносны. Ішоў ён аднойчы на пашу і сустрэў на шляху птушніцу, якая несла кошык з яйкамі.

А пастушок вазьмі ды кінь у кошык камень. Яйкі ўпалі і разбіліся. Пастушок зарагатаў, а птушніца раззлавалася і ад прыкрасці крыкнула ўслед юнаку:





– Каб табе не вырасці болей ні на цалю, пакуль не адшукаеш прыўкрасную Баральгіну з трыма спеўнымі яблыкамі!

– Што яшчэ за спеўныя яблыкі? Відаць, гэтая птушніца зусім з глузду з'ехала!

І пастушок як нічога ніякага пайшоў далей сваёй дарогай. Ён бы і забыў словы птушніцы, ды толькі ейны праклён пачаў здзяйсняцца.

З тае пары перастаў пастушок расці. Як ні карміла яго маці, ён толькі худзеў з кожным днём.

